# Асаблівасці развіцця агульнаадукацыйнай школы на Беларусі ў 20-я гады XX стагоддзя.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі беларускі народ атрымаў права на стварэнне нацыянальнай школы. Культурнае і нацыянальнае развіццё заўсёды цесна звязаны паміж сабой. Палітыка нацыянальна-культурнага і нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва ў БССР у 1920-я гады атрымала назву беларусізацыі. Яе вытокі — ў беларускім нацыянальна-вызваленчым руху, у ідэях беларускага нацыянальнага адраджэння, выкрышталізаваных інтэлігенцыяй і сфармуляваных у праграмах беларускіх нацыянальных дэмакратычных і сацыялістычных партый. Ужо ў 1920/21 навучальным годзе Наркамасветы ССРБ прымаліся канкрэтныя меры па адкрыцці беларускіх школ, навучанні ў іх роднай мове, а ў школах нацыянальных меншасцей — па вывучэнні беларускай мовы як абавязковага прадмета.

Вялікае значэнне для ажыццяўлення нацыянальнай палітыкі ў галіне народнай асветы мелі X (сакавік 1921 г.) і XII (красавік 1923 г.) з'езды РКП(б), якія развілі і ўдакладнілі задачы, формы, метады палітыкі па нацыянальнаму пытанню. Пачынаючы з 1921 г., у Беларускай ССР праходзілі партыйныя канферэнцыі, з'езды, Пленумы ЦК КП(б)Б, нарады па нацыянальнаму пытанню. У канцы 1921 — пачатку 1922 гг. як вынік працы дыскусійных сходаў Мінскай партыйнай арганізацыяй былі выдадзены тэзісы "Беларускае нацыянальнае пытанне і Камуністычная партыя".

Народным камісарам асветы ў 1921—1926 гг. працаваў вядомы грамадскі дзеяч, вучоны, асветнік Усевалад Макаравіч Ігнатоўскі, які ўнёс значны ўклад у станаўленне і развіццё народнай асветы, адраджэнне беларускай культуры і мовы. У Наркамасветы быў створаны беларускі аддзел (26 студзеня 1922 г.), у павятовых аддзелах народнай адукацыі — беларускія пададдзелы. "Спачатку 2—3 гады ў працэсе беларусізацыі быў арганізацыйна-агітацыйны перыяд, а затым -паглыбленне беларускай культуры, укараненне яе ва ўсе шчыліны быцця", - так выказаўся на XI з'ездзе КП(б)Б У.М. Ігнатоўскі. Яшчэ ён указаў на вялікія цяжкасці ў правядзенні беларусізацыі [1, с.4]. Частка былой інтэлігенцыі, выхаванай у вялікадзяржаўным чыноўніцкім духу, актыўна выступала супраць беларусізацыі. Супраць гэтых перашкод з боку Наркамасветы праводзіліся рашучыя меры. Ва ўстановах Наркамасветы адкрываліся беларускія курсы, гурткі для супрацоўнікаў аддзелаў на месцах, настаўніцкія курсы.

Пераважная большасць народных настаўнікаў пачатковых школ успрынялі меры Наркамасветы па ўкараненні беларускай мовы і адраджэнні нацыянальнай культуры станоўча. Вясковыя настаўнікі ведалі родную мову. Арганізаваныя Наркамасветы беларускія настаўніцкія курсы дапамаглі ім лепш авалодаць беларускай мовай. Вялікую ролю адыгралі арганізаваныя ў 1923 г. двухгадовыя "Вышэйшыя курсы беларусазнаўства" з выкладаннем прадметаў, якія давалі грунтоўныя веды па гісторыі і геаграфіі Беларусі, беларускай мове і літаратуры, нацыянальна-вызваленчаму руху, народнай педагогіцы, этнаграфіі і фальклору. Арганізоўваліся і кароткатэрміновыя курсы (3, 6 месяцаў, аднагадовыя). У ліпені - жніўні 1923 г. у Мінску працавалі 6-тыднёвыя акруговыя беларускія настаўніцкія курсы пры Галоўпалітасвеце НКА на 66 чалавек. На курсах

выкладалі Я. Лёсік, А. Смоліч і іншыя выкладчыкі. Працавалі настаўніцкія курсы пры педтэхнікумах і педфаку БДУ.

У 1924 г. была прынята пастанова ЦВК БССР, у якой адзначалася пасіўнасць, адсутнасць планамернай работы, сістэмы ў навучанні беларускай мове. З 1926/27 навучальнага года (згодна з пастановай Наркамасветы ад 5 верасня 1926 г.) заняткі ў навучальных установах з першага курса вяліся на беларускай мове. Пры паступленні ў тэхнікум і ВНУ патрэбна было здаваць экзамен па беларускай мове, ва ўсіх школах нацыянальных меншасцей абавязковым было навучанне беларускай мове. У 1926/27 навучальным годзе былі арганізаваны настаўніцкія курсы ў Гомельскім і Рэчыцкім паветах , далучаных да БССР.

12 лютага 1926 г. Народным камісарам асветы БССР быў прызначаны Антон Васільевіч Баліцкі (з 1921 г. працаваў намеснікам Наркамасветы У.М. Ігнатоўскага). Ён быў барацьбітом за ажыццяўленне ў рэспубліцы нацыянальнай палітыкі ў галіне народнай асветы, культурнай рэвалюцыі. Яго штодзённа хвалявалі пытанні беларускай культуры і мовы, станаўлення працоўнай школы, дашкольных, прафесійных і вышэйшых навучальных установ. Аб навучанні на беларускай мове выдаваліся інструкцыйныя пісьмы, распараджэнні, метадычныя лісткі, вяліся даследаванні вынікаў прыёмаў у тэхнікумы, іншыя навучальныя ўстановы. Пытанне беларусізацыі шырока адлюстроўвалася на старонках часопіса "Асвета".

Як станоўчы вынік, у 1927/28 навучальным годзе з 5 163 чатырохгодак 4 363 былі беларускія, з 2 797 сямігодак у 1 571 навучанне вялося на беларускай мове [2, с.92-95]. У рамках палітыкі беларусізацыі адкрываліся таксама рускія, яўрэйскія, польскія школы. Упершыню ў гісторыі Беларусі ў 1920-я гады былі зроблены першыя крокі ў станаўленні і развіцці нацыянальнай школы. Нягледзячы на перашкоды і вялікія цяжкасці, беларускія вучоныя і настаўнікі з энтузіязмам працавалі на ніве народнай асветы. Вопыт арганізацыі вучэбна-выхавачай работы нацыянальных школ мае вялікае значэнне для сучаснасці.

У пачатку 1920-х гадоў урадам былі вызначаны задачы школы і прынцыпы яе функцыяніравання. У аснову пабудовы народнай школы ў ССРБ былі пакладзены Палажэнне аб адзінай працоўнай школе і пастанова Першай партыйнай нарады па народнай адукацыі, якая праходзіла ў Маскве ў канцы снежня 1920 - пачатку студзеня 1921 г. У Палажэнні аб адзінай працоўнай школе былі сфармуляваны мэты і задачы савецкай школы, вызначаны змест і арганізацыя яе работы. Упершыню на школу ўскладалася задача выхавання новага чалавека, сумленнага грамадзяніна рабоча-сялянскай рэспублікі, арганізатара і будаўніка сацыялістычнай дзяржавы і сацыялістычнага быту на аснове працоўнага метаду [3, арк.99]. Прынятая партыйнай нарадай школьная сістэма была адобрана канферэнцыяй КП(б)Б і II Усебеларускім з'ездам Саветаў.

На II Усебеларускім з'ездзе Саветаў, які праходзіў у Мінску ў снежні 1920 г., былі вылучаны наступныя асноўныя задачы па праблемах асветы: усебаковая палітычная асвета працоўных мас, арганізацыя сеткі навучальных устаноў на мясцовых мовах, падрыхтоўка для іх работнікаў асветы; хутчэйшы рамонт школьных будынкаў, забеспячэнне іх палівам; адкрыццё Беларускага джяржаўнага універсітэта; арганізацыя

Библиотека БГУИР

прафесійна-тэхнічнай адукацыі; дапамога дзецям сялян і беднаты, арганізацыя дзіцячага харчавання, стварэнне школьных сталовых; прыцягненне ўсіх школьных работнікаў Беларусі да арганізацыі школьнай справы, забеспячэнне іх харчаваннем, мануфактурай [4, арк.14-15].

У снежні 1920 г. у Мінску адбылася Першая партыйная нарада па пытаннях народнай адукацыі, скліканая ЦК КП(б)Б. Выпрацаваная першай партыйнай нарадай па народнай асвеце школьная сістэма была адобрана ў кастрычніку 1921 г. V з'ездам Камуністычнай партыі Беларусі. Наркамасветы распрацаваў мерапрыемствы па пераходу на новую сістэму народнай асветы. Рэарганізацыі школ папярэднічала дэталёвае вывучэнне матэрыяльнай базы і кваліфікацыі педагогаў школ II ступені. Наркамасветы прыняў канкрэтны план рэарганізацыі школ II ступені. Такіх школ у 1921-1922 гг. з поўным складам класаў у Беларусі працавала 56. Таму практычнае правядзенне гэтай рэформы не сустрэла вялікіх цяжкасцей.

Пытанне аб правядзенні рэформы было разгледжана калегіяй НКА ССРБ і прапанавана канферэнцыі загадчыкаў павятовых аддзелаў народнай адукацыі і загадчыкам школьных пададдзелаў. У выніку разгляду стала зразумела, што на Беларусі правесці яе, з аднаго боку, лягчэй у параўнанні з Расіяй і Украінай. З другога - тыя ж прычыны, па якіх неабходна перайсці да рэформы, асабліва рэльефна выступаюць на Беларусі. Да таго ж у нас школ II ступені ў поўным сэнсе гэтага слова было вельмі мала ў сувязі з частымі акупацыямі.

Наркамасветы ССРБ, прыняў 16 лютага 1922 г. новую сістэму народнай адукацыі, па якой сямігадовая агульнаадукацыйная політэхнічная школа была прызнана асноўным тыпам масавай навучальнай установы ў нашай рэспубліцы. Яна ахоплівала дзяцей і падлеткаў ва ўзросце ад 8 да 15 гадоў і падрыхтоўвала іх да прафесійнай адукацыі ў чатырохгадовых тэхнікумах [5, с.1]. Адзіная працоўная школа з'яўлялася дзяржаўнай, існаванне прыватных школ не дазвалялася, хоць згодна са Статутам адзінай працоўнай школы ССРБ, насельніцтва мела права арганізоўваць школы з дазволу раённых выканаўчых камітэтаў на ўласныя сродкі паводле ўзгаднення з органамі народнай асветы [ 6, с.3 ].

Адзіная працоўная сямігадовая школа падзялялася на 2 канцэнтры: першы складаўся з 4 груп навучання для дзяцей 8 - 1 1 гадоў, другі - з трох груп (класы ў той час называліся групамі) навучання для дзяцей 12 - 15 гадоў. Абодва канцэнтры маглі існаваць як разам, так і паасобку [3, арк. 100-101]. Адзінай школа называлася таму, што ўся сістэма ад дзіцячага сада да ўніверсітэта прадстаўляла сабой адну неразрыўную лесвіцу. Усе дзеці павінны былі паступаць у адзін і той жа тып школы і пачынаць сваю адукацыю аднолькава [7, арк.60]. Колькасць навучэнцаў у кожнай групе сямігадовай школы не павінна была перавышаць 40 чалавек, прычым хлопчыкі і дзяўчынкі вучыліся разам. Навучанне павінна было весціся на беларускай мове. Мова беларуская і руская (першая - як мова большасці насельніцтва Беларусі, другая — як маючая агульнасаюзнае значэнне) з'яўляліся абавязковымі прадметамі выкладання ў сямігадовай школе. Абавязковым з'яўлялася і выкладанне адной замежнай мовы.

Библиотека БГУИР

Канкрэтны план рэарганізацыі быў распрацаваны Наркамасветы ССРБ. Згодна з ім, школы II ступені, якія мелі ў сваім складзе толькі два малодшыя класы, лёгка рэарганізоўваліся ў сямігодкі шляхам зліцця з класамі пачатковай школы. Школы II ступені, якія мелі ў сваім складзе ўсе 4 класы, прадугледжвалася рэарганізаваць у сямігодкі і тэхнікумы паступова на працягу некалькіх гадоў з такім разлікам, каб забяспечыць вучням двух старшых класаў магчымасць скончыць поўны курс або паступіць у тэхнікум.

Рэарганізацыі папярэднічала дэталёвае вывучэнне матэрыяльнай базы школ. Па якасці абсталявання школы дзяліліся на 4 катэгорыі: са спецыяльным абсталяваннем, добрым, здавальняючым і дрэнным. Такая класіфікацыя школ дазваляла вызначыць базу для стварэння тэхнікумаў. Колькасць школ II ступені ў Беларусі стала хутка скарачацца, іх рэарганізацыя супала з ажыццяўленнем мерапрыемстваў па планамернаму скарачэнню школьнай сеткі, выкліканаму цяжкім эканамічным становішчам краіны. Са 122 поўных і няпоўных школ II ступені, якія працавалі ў пачатку 1921 г., да 1 студзеня 1922 г. захавалася толькі 27. Да вясны 1922 г. школы II ступені на тэрыторыі Беларусі перасталі існаваць [8, с.98]. Сямігодка на доўгі час стала асноўным тыпам агульнаадукацыйнай школы. Працягваць адукацыю магчыма было ўжо толькі па лініі прафесійных навучальных устаноў. Падрыхтоўка ў тэхнікумы з'яўлялася адной з асноўных задач, якія вырашаліся сямігадовай працоўнай школай. Часова не ставілася задача развіцця школ II ступені.

На базе сямігодкі было вырашана ствараць спецыяльную адукацыю. Асноўнай яе формай Партыйная нарада прызнала тэхнікум, дзе адначасова павінна была завяршацца агульная сярэдняя адукацыя. Дзевяцігадовыя школы былі рэарганізаваны ў сямігодкі. Такая сістэма народнай адукацыі ў асноўным адпавядала ў той час задачам гаспадарчага і культурнага будаўніцтва. Яна давала навучэнцам той аб'ём ведаў, які быў дастатковым для падрыхтоўкі масавых кадраў прамысловых рабочых. Узровень агульнай адукацыі, атрыманы ў сямігадовай школе, даваў таксама магчымасць лепш разбірацца ў асноўных пытаннях палітыкі Савецкай дзяржавы. Асаблівасцю новай сістэмы народнай адукацыі з'ўлялася тое, што ўзрост навучэнцаў агульнай і політэхнічнай адукацыі быў скарочаны з 17 да 15 гадоў. Звярталася ўвага на ўтварэнне прафесійнай школы.

Пачатак 1922 г. у ССРБ характарызаваўся планавым скарачэннем кіруючага апарату і школьнай сеткі да ўзроўню, які адпавядаў яе матэрыяльньгм магчьгмасцям. Са 120 штатных работнікаў Наркамасветы ССРБ у яго апараце засталося толькі 54 [9, с.51]. У дзяржаўнай школьнай сетцы заставаліся толькі тыя школы, якія мелі больш-менш прыгодныя памяшканні і абсталяванне. Адначасова прымаліся меры па захаванні школ, якія існавалі на сродкі мясцовага насельніцтва. У выніку да 1922/1923 навучальнага года колькасць агульнаадукацыйных школ скарацілася на 746 чалавек, навучэнцаў - на 31 540 і настаўнікаў - на 2 733 [10, с.10]. У той час на Беларусі сярэдні працэнт дзяцей школьнага ўзросту, якія вучыліся, быў роўны 37. Астатнія 63% дзяцей заставаліся па-за школай [9, с.4]. Далейшае скарачэнне было раўназначна ліквідацыі народнай адукацыі.

Каб спыніць скарачэнне школьнай сеткі і захаваць большую колькасць школ, патрэбна была матэрыяльная падтрымка грамадскасці. Згодна з пастановай СНК ССРБ, у 1921 г. у гарадах і мястэчках былі створаны школьна-гаспадарчыя саветы. У склад саветаў

Бібліятэка БГУІР

уваходзілі прадстаўнікі аддзела народнай адукацыі, саюза работнкаў асветы, а таксама культустаноў, якія знаходзіліся ў кампетэнцыі пэўнага савета, прадстаўнікі мясцовага насельніцтва, фабрычна-заводскіх камітэтаў. Бацькоўскія арганізацыі пры школах уваходзілі ў савет у поўным складзе. Яны клапаціліся пра забеспячэнне школ абсталяваннем, арганізоўвалі рамонт памяшканняў, праводзілі суботнікі, нядзелі дапамогі школе. Галоўнай мэтай савета з'яўлялася арганізацыя рэальнай дапамогі школе ў перыяд, калі дзяржава не мела неабходных сродкаў для забеспячэння патрэб народнай адукацыі. У ліку мерапрыемстваў было і ўвядзенне павіннасцей насельніцтва на карысць устаноў асветы. Прафсаюзныя арганізацыі адлічвалі сродкі на патрэбы школы. Усё гэта дазволіла захаваць большую іх частку ў асабліва цяжкі перыяд станаўлення дзяржавы.

Для паляпшэння матэрыяльнага стану школ СНК Беларусі дазволіў Наркамасветы рэспублікі ствараць уласныя вытворчыя прадпрыемствы, швейныя і рамонтныя майстэрні і сельскагаспадарчыя фермы, якія абслугоўваліся як сваімі навучэнцамі, так і супольна з кааператывамі, арцелямі і прыватнымі асобамі на дагаворных асновах [11, с.51]. Пастановай ад 25 жніўня 1922 г. СНК БССР прапанаваў Наркамасветы ўтрымліваць за дзяржаўны кошт толькі частку школ, астатнія перавесці на няпоўнае дзяржаўнае забеспячэнне. У адпаведнасці з гэтай пастановай Наркамасветы пакінуў на фінансаванні з дзяржаўнага бюджэта прафтэхнічныя школы, палітыка-асветніцкія ўстановы, дзіцячыя дамы і сады. Затраты на ўтрыманне агульнаадукацыйных школ, якія ўвайшлі ў скарочаную дзяржаўную сетку, былі падзелены паміж дзяржавай і мясцовым насельніцтвам.

Удзел насельніцтва ва ўтрыманні школ прыняў розныя формы ў горадзе і вёсцы. У гарадах і буйных мястэчках была ўведзена плата за навучанне, а ў весках у 1922/23 навучальным годзе праводзілася самаабкладанне насельніцтва, пазней заключаліся калектыўныя дагаворы паміж насельніцтвам і школай, згодна з якімі сяляне абавязваліся ўтрымліваць школы за свой кошт. Па ўсёй рэспубліцы насельніцтва (бацькі вучняў) утрымлівала 122 школы, так званыя дагаворныя школы. Усе гэтыя школы былі ўключаны ў сетку 1925/26 навучальнага года [12, арк.21]. Тым не менш пры недахопе сродкаў у дзяржавы дагаворы адыгралі станоўчую ролю, бо дазволілі захаваць значную колькасць школ. Плата за навучанне ў горадзе з'яўлялася толькі дадаткам да дзяржаўнага і мясцовага бюджэту і забяспечвала ў 1922/23 навучальным годзе 2,8% агульных затрат Наркамасветы [13, с.8]. Гэта форма дапамогі насельніцтва школе праіснавала нядоўга.

Перыяд да 1922/23 навучальнага года характарызаваўся вельмі цяжкім матэрыяльньгм становішчам і ўтварэннем новых форм народнай адукацыі. У новым навучальным годзе пачыналася арганізаваная планавая сістэматычная праца па народнай адукацыі. Асветніцкая сетка прыводзілася ў адпаведны парадак, зацвярджаліся штаты кожнага тыпу асветных устаноў, выпрацоўваліся праграмы для навучальных устаноў. Матэрыяльны стан школ значна палепшыўся як за кошт вытворчых адлічэнняў, так і за кошт калектыўнай дапамогі бацькоў (плата за навучанне) у гарадах і калектыўных дагавораў мясцовых органаў улады з насельніцтвам на прадмет дапамогі школе ў сельскай мясцовасці [14, арк.98].

Библиотека БГУИР

У сістэме народнай адукацыі ў 1920-я гады на Беларусі з'явіліся школы, у якіх акрамя вывучэння агульнаадукацыйных прадметаў здзяйснялася вытворчае навучанне. Гэта школы сялянскай моладзі (ШСМ) і фабрычна-заводскія сямігодкі (ФЗС). У 1924 г. органы народнай асветы, выкарыстоўваючы вопыт Расійскай Федэрацыі, адкрылі ў вёсках першыя 10 ШСМ. Змест работы новага тыпу школ моладзі вызначыў XIII з'езд Камуністычнай партыі. Колькасць школ гэтага тыпу асабліва ўзрасла ў перыяд масавай калектывізацыі. Пасля XV з'езда ЦКП(б), які аб'явіў курс на калектывізацыю, Наркамасветы справу стварэння ШСМ стаў лічыць адной з самых важных задач. У дапаўненні да праграмы ШСМ, падрыхтаванай навукова-метадычным кабінетам Наркамасветы БССР у 1928 г., ад кожнага навучэнца ШСМ патрабавалася не толькі ўсведамляць перавагі буйной калектыўнай гаспадаркі перад дробнай прыватнай, але і быць адным з арганізатараў гэтай гаспадаркі [15, с.124]. Дзяржава ўсяляк стымулявала ў гэтых школах вучобу сялянскіх дзяцей, выдаючы ім стыпендыі і пашыраючы стварэнне інтэрнатаў. У 1927 годзе дзяржаўныя стыпендыі атрымлівалі 53% навучэнцаў ШСМ. Тэрмін навучання ў ШСМ быў 3-хгадовы. У іх прымаліся сялянскія дзеці ва ўзросце 15-18 гадоў. Для паступлення патрэбны былі веды ў аб'ёме 3-4 класаў пачатковай школы.

Агульнаадукацыйная частка вучэбнага плана ШСМ у асноўным адпавядала II канцэнтру сямігадовай школы. На тэарэтычны курс па аграноміі адводзілася 5-6 гадзін у тыдзень, апрача таго арганізоўвалася вытворчае навучанне. Базай у правядзенні вытворчага навучання з'яўляліся: а) прышкольная гаспадарка з майстэрнямі; б) калгасы, саўгасы і першапачатковыя сялянска-гаспадарчыя аб'яднанні; в) гаспадаркі бацькоў вучняў бядняцкага і серадняцкага сялянства. Амаль усе школы мелі аграномаў. У гады сацыялістычнага пераўтварэння сельскай гаспадаркі колькасць гэтых школ стала хутка павялічвацца. Дастаткова сказаць, што ў 1926/27 навучальным годзе іх налічвалася ўсяго толькі 12, у 1927/28 - 26, у 1928/29 - 27, а ў 1929/30 - колькасць іх узрасла да 56 [16, с105]. Надалей прафесіяналізацыя страчвала свой сэнс, і ў 1934 годзе ШСМ былі пераўтвораны ў сямігадовыя школы звычайнага тыпу.

Пачынаючы з 1926 года, у гарадах рэспублікі пры некаторых заводах і фабрыках адкрываюцца фабрычна-заводскія сямігодкі. Уся вучэбна-выхаваўчая работа ў гэтых школах цесна ўвязвалася з вытворчай дзейнасцю базавага прадпрыемства, з грамадска-палітычным жыццём рабочага калектыву. Камплектаванне фабрычна-заводскіх сямігодак праводзілася такім чынам, каб 60-70% вучняў складалі дзеці рабочых дадзенага прадпрыемства. Пры ФЗС былі створаны майстэрні, цесна звязаныя з характарам вытворчасці завода. У іх вучні першых чатырох груп авалодвалі працоўнымі працэсамі. З пятага года навучання школьнікі знаёміліся з вырабамі прамысловай прадукцыі непасрэдна на заводзе. На грамадска карысную і вытворчую працу выдзялялася ў 1-4 класах па дзве гадзіны, у 5-6 - па чатыры і ў 7 - па шэсць гадзін у тыдзень [17, с. 11]. Колькасць ФЗС з кожным годам павялічвалася. Так, напрыклад, у 1926/27 навучальным годзе іх было 14, у 1927/28 - 33, у 1928/29 - 56, у 1929/30 - 143. У 1930 г. каля 30% сямігадовых школ у гарадах было прымацавана да прамысловых прадпрыемстваў, 4% - да прадпрыемстваў сувязі і 1,7% - да МТС [16, с.104]. Фабрычна-заводскія сямігодкі адыгралі станоўчую ролю ў камплектаванні прафесійна-тэхнічных школ.

Бібліятэка БГУІР

У 1920-я гады атрымалі пашырэнне вячэрнія агульнаадукацыйныя школы рабочай моладзі і агульнаадукацыйныя курсы розных тыпаў для дарослага насельніцтва. Мэтай вячэрніх школ рабочай моладзі з'яўлялася падрыхтоўка моладзі ў аб'ёме шасці класаў звычайнай школы. Акрамя такіх школ з 1927 г. у вялікіх гарадах пачалі адкрывацца вячэрнія школы павышанага тыпу, якія ставілі сваёй задачай павысіць агульнаадукацыйны і тэхнічны ўзровень рабочых, а затым праз кароткатэрміновыя курсы рыхтаваць сваіх слухачоў для паступлення ў вышэйшыя навучальныя ўстановы.

У аднаўленчы перыяд адкрываюцца вячэрнія школы сялянскай моладзі з мэтай падрыхтаваць селяніна-культурніка (срок навучання - двухгадовы). Гэтыя школы заваявалі аўтарытэт сярод сялянскай моладзі і занялі вызначальнае месца ў сістэме народнай адукацыі. На 15 снежня 1927 г. агульнаадукацыйных курсаў і школ усіх тыпаў для дарослых (вячэрнія, школы рабочай моладзі, сялянскія курсы і школы павышанага тыпу) налічвалася 183 з 13 437 навучэнцамі. Акрамя таго, працавалі рабочыя і сялянскія універсітэты (1 - у Мінску, 1 - у Оршы), у якіх займалася 229 навучэнцаў [2, с. 104].

Такім чынам, да канца аднаўленчага перыяду ў БССР была сфарміравана новая сістэма народнай адукацыі. Пасля рэформы 1922 г. асноўным звяном яе стала не дзевяцігадовая, а сямігадовая працоўная політэхнічная школа ў складзе двух канцэнтраў. У мэтах набыцця вучнямі некаторых навыкаў і набліжэння школы да жыцця Наркамасветы БССР арганізоўваў школы новага тыпу - школы сялянскай моладзі і фабрычна-заводскія сямігодкі. Яны з'яўляліся састаўной часткай новай сістэмы школьнай адукацыі.

У 1923/24 навучальным годзе станоўчыя вынікі ў развіцці эканомікі дазволілі выдзяляць больш сродкаў на народную адукацыю, у першую чаргу на пачатковую. Таму было спынена скарачэнне школьнай сеткі і пачалася планамерная падрыхтоўчая работа па ўвядзенні ўсеагульнага пачатковага навучання. Загадам ад 29 кастрычніка 1923 г. за № 192 Наркамасветы БССР зацвердзіў часовую камісію, якой даручыў у кароткі тэрмін распрацаваць праект арыенціровачнага плана развіцця школьнай сеткі на наступныя 10 гадоў, улічваючы тое, што школьная сетка павінна развівацца паступова, планава, з улікам эканамічнага развіцця рэспублікі [18, арк.100].

Пастановай СНК БССР ад 23 снежня 1923 г. за № 204 пры Наркамасветы зацверджана цэнтральная сеткавая камісія для распрацоўкі плана па ўвядзенні ўсеагульнага навучання ў БССР. Разам з тым, былі заснаваны раённыя сеткавыя камісіі пры Мінскім гарадскім аддзеле народнай адукацыі (11 снежня 1923 г., № 195) і такія ж камісіі пры ўсіх павятовых аддзелах народнай адукацыі, якія прыступілі да складання плана. План быў прыняты і зацверджаны 12 студзеня 1924 г. V Усебеларускім з'ездам Саветаў. Па гэтаму плану прадугледжвалася пабудаваць у паветах 54 новыя школы (па 2 настаўнікі на 100 вучняў кожная) у наступным парадку: па Бабруйскаму — 14, Барысаўскаму - 9, Мінскаму - 5, Мазырскаму - 8, Слуцкаму - 8, Чэрвенскаму - 10 школьных будынкаў [18, арк.104]. Наркамасветы Беларусі ў сваю чаргу прымае самыя рашучыя меры да правядзення ў жыццё пастаноў СНК, з'езда Саветаў. Усім пададдзелам Наркамасветы было даслана цыркулярнае распараджэнне аб заснаванні сеткавых камісій.

Библиотека БГУИР

У Наркамземе быў праведзены каштарыс на водпуск лясных матэрыялаў на будаўніцтва школ.

Работа на месцах па выкананні плана ўвядзення ўсеагульнай адукацыі ішла дружна і даволі паспяхова: паўсюдна былі арганізаваны павятовыя сеткавыя камісіі, устаноўлены пункты для размяшчэння планавых школ, у лясніцтвах адведзены дзялянкі, адкуль адпускаліся лясныя матэрыялы на школьныя пабудовы, створаны мясцовыя будаўнічыя камісіі, якія арганізоўвалі вырубку і вываз лесу.

У 1924 годзе да Беларусі была далучана тэрыторыя з пераважаючым беларускім насельніцтвам: восем паветаў Віцебскай губерні, шэсць - Гомельскай і два — Смаленскай. Па плошчы і колькасці насельніцтва рэспубліка павялічылася больш чым у два разы. У выніку ўзбуйнення Беларусі на яе тэрыторыі аказаліся дзве хоць і блізкія, але неаднолькавыя сістэмы народнай асветы. У сувязі з гэтым зноў узнікла пытанне аб перагдядзе Палажэння аб школе і яе структуры. V Усебеларускі з'езд Саветаў, які адбыўся напярэдадні ўзбуйнення рэспублікі, выпрацаваў для Наркамасветы прынцыповыя ўстаноўкі па гэтаму пытанню і прапанаваў яму "пераглядзець існуючую сістэму народнай асветы ў сэнсе больш цеснай сувязі паміж асобнымі часткамі і ў напрамку прыстасавання тыпаў навучальных устаноў да практычных патрэб краю, асабліва ў прафесійнай адукацыі". З'езд падкрэсліў вялікае значэнне "сельскагаспадарчага ўхілу ў школах сельскай мясцовасці і індустрыяльнага - у школах гарадоў" [19, с.8]. Кіруючыся ўказаннямі V з'езда Саветаў, Наркамасветы Беларусі пастановай у маі 1924 г. "Аб сістэме народнай асветы" прызнаў неабходным рэарганізаваць дзевяцігадовыя школы і школы II ступені ў сямігодкі па ўсёй тэрыторыі Беларусі.

Узбуйненне БССР у 1924 г., а затым новае раянаванне не спынілі працу па ўвядзенні ўсеагульнага навучання, але ж яна была некалькі затрымана, бо прыйшлося прыступіць да распрацоўкі новых планаў па новаму раяніраванню ўзбуйненай БССР. Праца гэта вялася на працягу 1924 г. У сакавіку 1925 г. планы былі прадстаўлены ў Дзяржаўную планавую камісію і быў складзены каштарыс.

Адзначым, што 1923/24 навучальны год перад тэрытарыяльным узбуйненнем праходзіў пад знакам выраўноўвання становішча ў розных галінах БССР. Гэта тычылася сістэмы народнай адукацыі, нацыянальнай палітыкі, матэрыяльнага становішча, арганізацыі культасветустаноў і г.д. Канчатковае выраўноўванне адбылося ў 1924/25 навучальным годзе. А ў наступны навучальны год — 1925/26 — вёўся актыўны працяг работы па ўвядзенні пачатковага ўсеагульнага навучання. Прыняты урадам БССР план увядзення ўсеагульнага пачатковага навучання меў вялікае палітычнае значэнне, бо садзейнічаў значнаму росту колькасці школ. Калі ў 1923/24 навучальным годзе школьная сетка ў Беларусі ўключала 79 поўных сямігодак і 94 няпоўныя, пачатковых школ — 1 347 [20, арк.71], то ў 1924/25 навучальным годзе 289 школ-сямігодак і 3 866 школ-чатырохгодак [12, арк.1]. У 1925/26 навучальным годзе ужо існавалі 4 533 пачатковыя школы і 292 сямігодкі. У гэтым годзе на 1000 чалавек насельніцтва прыходзілася 72,2 навучэнца, пачатковай школай было ахоплена 66,2% дзяцей школьнага ўзросту [16, с.97]. За два апошнія гады колькасць школ павялічылася ў горадзе на 26,5%, у вёсцы - на 9,2% [21, арк.30]. Дынаміка росту школьнай сеткі станоўчая. Але за гэты час высветліліся

Библиотека БГУИР

і перашкоды ў выкананні плана ўсеагульнага навучання: недастатковыя фінансавыя асігнаванні на планавае школьнае будаўніцтва і абсталяванне школ; выкарыстоўванне сродкаў не па прызначэнні ў некаторых акругах, скарочаны тэрмін навучання, - замест 4 гадоў - 2,5 недастатковыя ўмовы для навучання дзяцей беднаты, няўважлівыя адносіны лесаўстаноў да забеспячэння лесаматэрыяламі школ [22,арк.13].

Урад Беларусі правёў вялікую работу па падрыхтоўцы неабходных умоў для ажыццяўлення ўсенавуча. Дзяржава штогод павялічвала асігнаванні на развіццё народнай асветы і ажыццяўленне ўсеагульнага пачатковага навучання. Калі ў 1925/26 навучальным годзе з дзяржаўнага і мясцовага бюджэту на народную адукацыю было асігнавана 14 762 877 рублёў [23, с.222], то ў 1926/27 навучальным годзе - 19 695 890 рублёў, а ў 1928/29 навучальным годзе асігнаванні складалі больш за 35 млн. рублёў [8, с.8]. Гэтыя сродкі накіроўваліся на будаўніцтва новых і рамонт старых школьных памяшканняў, набыццё абсталявання, вучэбных дапаможнікаў, ацяпленне і асвятленне школ і г.д.

7 красавіка 1926 г. СНК і ЦВК БССР пастановай "Аб увядзенні ўсеагульнага абавязковага навучання" зацвердзілі асноўныя прынцыпы складання новых планаў усеагульнага навучання. Акрамя перспектыўных сеткавых і фінансавых планаў у 1927 г. былі падрыхтаваны па кожнаму раёну тэрытарыяльныя планы, у складанні якіх прынялі ўдзел мясцовыя настаўнікі і сельскія Саветы. Выканаць гэтыя дырэктывы стала магчымым толькі тады, калі былі вядомы вынікі дэмаграфічнага перапісу 1926 г. і школьнага перапісу 1927 г.

У 1927 г. ў рэспубліцы была разгорнута вялікая праца па здзяйсненні ўсеагульнага пачатковага навучання. У 1926/27 навучальным годзе ў 12 акругах БССР быў адкрыты 621 новы школьны камплект першага канцэнтра працоўнай школы, з іх 546 — у вёсках і 75 - у гарадах. Працэнт новых вясковых камплектаў складаў 87,6 [14, арк.88]. У 1927/28 навучальныь годзе фактычна адчыніўся 591 школьны камплект, гэта больш, чым меркавалася па плану [24, арк.104].

Істотную дапамогу школам і органам народнай адукацыі аказалі працоўныя рэспублікі. Згодна з пастановай СНК ад 3 ліпеня 1929 г., пры кожнай школе былі арганізаваны камітэты садзейнічання школе (камсоды), у абавязкі якіх уваходзілі не толькі правільнае выкарыстанне бюджэтных сродкаў, адпушчаных на дапамогу дзецям беднаты, а і прыцягненне да гэтай справы ініцыятывы і сродкаў насельніцтва, а таксама арганізацыя справы ўсеагульнага навучання ў дадзеным раёне і агульная матэрыяльная дапамога дадзенай школе. Рабочыя і сяляне дапамагалі школам у арганізацыі для дзяцей беднаты гарачых сняданкаў, забеспячэнні іх адзенем і абуткам, рамонце школ, нарыхтоўцы паліва і г.д.

Пераадольваючы многія цяжкасці, агульнаадукацыйная школа расла і развівалася. Але ў ёй былі недахопы: значная колькасць трохгодак - 22,8% да ліку чатырохгодак, вялікая перавага аднакамплектных школ - 63,8% усёй колькасці школ-чатырохгодак, высокая нагрузка на настаўніка - 45,4 вучня на адзін камплект, значны працэнт пераросткаў у школе - 40,5% [25, арк.86]. Сярэдняя працягласць навучання ў чатырохгодцы складала 2,6 года, што пры малой працягласці навучання давала слабыя

Библиотека БГУИР

вынікі ў працэсе ўздзеяння школы на вучня. Дзякуючы намаганням Савецкай улады, многія недахопы паступова ліквідаваліся.

Так, згодна з Пастановай СНК ад 3 ліпеня 1929 г. абавязковасць навучання разглядалася не толькі як абавязковасць паступлення ў школу, але і наведвання дзецьмі школы на працягу ўсяго навучальнага года і ўсіх чатырох гадоў навучання. Усе існуючыя ў рэспубліцы пачатковыя школы з трохгадовым курсам навучання (такіх школ было каля 20%) у бліжэйшыя два гады павінны быць пераведзены на чатырохгадовы курс навучання. У 1929/30 навучальным годзе прыкметна палепшыўся ўзроставы склад дзяцей, якія паступалі ў першую групу: паменшылася колькасць пераросткаў (старэйшых за 12 гадоў) у І канцэнтры працоўнай школы - з 32% у 1927/28 навучальным годзе да 23% [26, с.12]. Ішоў працэс рэарганізацыі аднакамплектных школ у двухкамплектныя, двухкамплектных — ў трохкамплектныя і г.д., што сведчыць пра скарачэнне школьнага радыуса. Асаблівасцю школьнай сеткі гэтага года з'яўлялася тое, што адкрыццё значнай часткі новых школьных камплектаў адбывалася ў калгасах і саўгасах, гэта значыць, у абагульненым сектары сельскай гаспадаркі. Улічваючы тое, што 1929/30 навучальны год быў першым годам абавязковага навучання, то нагрузка на настаўніка не паменшылася, а павялічылася да 47,1 навучэнца ў сярэднім на камплект, а праектавалася давесці колькасць навучэнцаў у класах-камплектах да 42 [26, с.12].

1929/30 навучальны год стаў вырашальным у справе ўвядзення ўсенавуча для дзяцей 8-гадовага ўзросту: па плану меркавалася адкрыць 1 335 новых школьных камплектаў, а было адкрыта 1 439, з іх у акруговых гарадах было адкрыта толькі 28 (2%), усе астатнія - 1 411 (98%) - у раёнах [26, с.9].

У выніку праведзеных мерапрыемстваў па выкананні ўсенавуча ў 1930/31 навучальным годзе ў першым канцэнтры адзінай працоўнай школы Беларусі было ахоплена 97% усіх дзяцей ва ўзросце 8-10 гадоў. Паводле звестак 82 раёнаў і 3 гарадоў, са 131 тыс. дзяцей ва ўзросце ад 11 да 15 гадоў вучылася 121 тыс, што складала 92,4% усіх пераросткаў. У 10 гарадах і 21 фабрычна-заводскім раёне ў V групе займалася 95% дзяцей, якія закончылі чатырохгадовую школу ў 1929/30 навучальным годзе. Такім чынам, у 1930/31 навучальным годзе ў БССР было ў асноўньгм уведзена ўсеагульнае абавязковае навучанне дзяцей 8-10 - гадовага ўзросту, а таксама пераросткаў ва ўзросце 11-15 гадоў і пачалася работа па ажыццяўленні ўсенавуча ў аб'ёме сямігадовай школы [27, с.163-164].

У гады першай пяцігодкі назіраўся значны рост сямігадовых школ і колькасці вучняў у іх. Калі ў 1925/26 навучальным годзе ў БССР працавалі 292 сямігодкі, то ў 1930/31 - 580, а колькасць вучняў павялічылася са 102 179 да 184 587 [10, с.10].

У 1929/30 навучальным годзе сямігодкі адкрыліся амаль што ва ўсіх буйных населеных пунктах. Аднак іх не хапала, каб задаволіць патрэбу дзяржавы ў падрыхтоўцы кантынгенту навучэнцаў для сярэдніх навучальных устаноў. Сетка сямігодак у 1929/30 навучальньгм годзе не магла ахапіць усіх дзяцей, якія скончылі 4 класы і жадалі працягваць адукацыю, бо адна сямігодка абслугоўвала 14 пачатковыгх школ. Каб не дапусціць далейшае адставанне ў развіцці сямігадовых школ, ЦК КП(б) Беларусі і урад прынялі пастанову аб пашырэнні сеткі школ-сямігодак.

Библиотека БГУИР

У 1930/31 навучальным годзе ўсе дзеці прамысловых цэнтраў і фабрычна-заводскіх пасёлкаў, якія закончылі чатырохгодкі, пайшлі ў пятыя групы. Аднак частка няпоўных сярэдніх агульнаадукацыйных школ да канца 1920-х гадоў была рэарганізавана ў фабрычна-заводскія сямігодкі і школы калгаснай моладзі, якія былі прызнаны лепшымі формамі політэхнізацыі навучання і павінны былі даваць не толькі агульнаадукацыйныя веды, але і знаёмства з асновамі вытворчасці і такім чынам здзяйсняць сувязь навучання з навакольным жыццём.

Карэнная рэарганізацыя сістэмы адукацыі, пашырэнне сеткі навучальных устаноў, ажыццяўленне ўсеагульнага абавязковага навучання патрабавалі вызначэння зместу навучання і выхавання, складання новых вучэбных планаў і праграм, стварэння новых падручнікаў. У вучэбным плане, складзеным у адпаведнасці з "Асноўнымі прынцыпамі арганізацыі працоўнай сямігадовай школы", надавалася перавага прыродазнаўчым навукам. Вывучэнне прыродазнаўства і геаграфіі, побач з роднай мовай і матэматыкай, пачыналася з першага класа. Грамадскія навукі (гісторыя, а затым грамадазнаўства) вывучаліся пачынаючы з другога класа. Працоўнае навучанне (сюды адносілася і пасільная фізічная праца) уводзілася на трэцім годзе навучання: у III-IV-V класах - па 2 гадзіны ў тыдзень, у VI-VII - па 3 гадзіны.

Першыя праграмы агульнаадукацыйных школ Беларусі, выдадзеныя ў 1922 г., былі прадметнымі: яны арыентавалі настаўніка галоўным чынам на тэарэтычнае вывучэнне курса школьных прадметаў. Праграмы не лічыліся абавязковымі. Настаўнікі сумесна з органамі народнай асветы мелі права ўносіць змены ў гэтыя праграмы з улікам мясцовых умоў. Нагляднае ўяўленне пра такія праграмы дае "Прыкладная праграма па матэматыцы для сямігадовай працоўнай школы Беларусі". Складальнікі праграмы, захоўваючы прынцып карэляцыі, запланавалі на ўсе чатыры гады навучання ў пачатковай школе паралельнае вывучэнне арыфметыкі і элементарнага геаметрычнага матэрыялу, у V класе вывучалася арыфметыка з элементамі геаметрыі, у VI - арыфметыка з элементамі алгебры і геаметрыі, у VII - алгебра і геаметрыя. Адзіным напамінам пра неабходнасць сувязі матэматыкі з навакольным жыццём былі некаторыя вымяральныя работы на мясцовасці. Праграму неабходна было дапрацоўваць з улікам тых асноўных патрабаванняў, якія былі вызначаны палажэннем і дэкларацыяй аб адзінай працоўнай школе.

Прадметныя праграмы 1922 г. яшчэ два гады дапрацоўваліся, і толькі ў 1924 г. прадметная сістэма навучання была прадстаўлена ў закончаным, цэласным выглядзе. Праграмы 1924 г. давалі найбольш поўнае ўяўленне аб першым вопыце прадметнай сістэмы навучання, якая ва ўмовах Беларусі існавала параўнаўча доўга. Аднак усе прадметныя праграмы, выдадзеныя пасля 1924 г., ужо ў той ці іншай меры прыстасоўваліся да комплексных тэм. Таму кульмінацыйным пунктам развіцця прадметнай сістэмы навучання ў школах БССР у 1920-я гады неабходна лічыць праграмы 1924 г.

У 1924 г. Наркамасветы БССР выдаў апошні варыянт прадметных праграм для III-IV класаў пачатковай школы, якімі настаўнікі карысталіся да 1926/27 навучальнага года. Праграмы лічыліся часовымі. У іх былі ўлічаны міжпрадметныя сувязі, але кожны прадмет захоўваў самастойнае значэнне. Вучні трэцяга і чацвёртага гадоў навучання

Библиотека БГУИР

вывучалі матэматыку, рускую і беларускую мовы, літаратуру, прыродазнаўства, грамадазнаўства, геаграфію. Апошнія тры прадметы вывучаліся ў асноўным на мясцовым матэрыяле. У гэтым годзе былі выдадзены прадметныя праграмы і для другога канцэнтра сямігадовай школы (пяты - сёмы гады навучання). Аўтары праграм рэкамендавалі разглядаць рэальна існуючыя сувязі паміж з'явамі і аб'ектамі рэчаіснасці ў межах блізкіх па зместу прадметаў. У прыватнасці, працоўны напрамак канкрэтна ўвасабляўся ў праграмах прыродазнаўчага цыкла. У V класе прадугледжваліся розныя доследы па вырошчванні сельскагаспадарчых культур, прыродазнаўчыя экскурсіі. У VI класе батаніка і заалогія вывучаліся ў сістэматычным плане. Абагульняліся звесткі аб прыродзе, набытыя ў працэсе назіранняў, доследаў і практычнай работы па заданню настаўніка. У VII класе вывучаліся агульная біялогія і тэорыя Дарвіна. Вучні атрымлівалі на занятках па гэтаму прадмету практычна неабходныя для іх веды па гігіене школьніка. У зборнік задач па алгебры былі ўключаны задачы, складзеныя на матэрыяле фізікі, геаграфіі, прыродазнаўства. Законы фізікі разглядаліся ў арганічнай сувязі з тэхнікай. Праграма па фізіцы прадугледжвала азнаямленне вучняў з законамі фізікі, якія дапамагалі растлумачыць прынцыпы работы паравой машыны, электрычных рухавікоў, тэлеграфа і іншых сродкаў сувязі, найбольш распаўсюджаных аптычных прыбораў.

У 1925 г. Наркамасветы БССР, кіруючыся імкненнем максімальна зблізіць школьнае навучанне з жыццём і працай рабочых і сялян, прыняў рашэнне замяніць прадметную сістэму выкладання комплекснай. У тым жа годзе былі выдадзены праграмы для пачатковай школы, складзеныя ў адпаведнасці з патрабаваннямі комплекснай сістэмы. У аснову іх былі пакладзены комплексныя праграмы Дзяржаўнага вучонага савета РСФСР. Складальнікі праграм улічвалі вопыт прымянення комплекснай сістэмы навучання, у I-II класах паасобных школ Беларусі ў 1924/25 навучальным годзе. Для I-III класаў комплексныя праграмы былі распрацаваны ў двух варыянтах: для сельскіх і гарадскіх школ. Праграма IV класа, увядзенне якой намячалася ў 1926/27 навучальным годзе, была адзінай для гарадскіх і сельскіх школ.

У тлумачальнай запісцы да першай комплекснай праграмы пачатковай школы адзначалася, што пры такой сістэме навучання месца прадмета займае комплекс. Вывучаюцца не вучэбныя прадметы, а пэўныя аб'екты і з'явы навакольнага жыцця. Аўтары праграмы тлумачылі далей, што, хоць вучні будуць набываць веды непасрэдна з жыцця, нельга недаацэньваць ролю кнігі. Праўда, рабілася агаворка, што вучань будзе чытаць кнігу, а не завучваць, як гэта было ў старой школе. Не ўлічваючы таго, што ў школах адчувалася нястача падручнікаў, аўтары праграмы пісалі: "Часта там, дзе старая школа задавальнялася адной дагматычна напісанай кнігай, новая школа патрабуе некалькі кніжак, з якіх вучань выбірае тое, што яму патрэбна". Патрабаванне мець добра ўкамплектаваныя школьныя бібліятэкі, якія б давалі багаты матэрыял для класнага і пазакласнага чытання, яўна не адпавядала матэрыяльным магчымасцям школ таго часу.

Аўтары праграмы падкрэслівалі, што змест комплексаў павінен забяспечваць фарміраванне матэрыялістычнага светапогляду вучняў. Значнае месца ў вучэбна-выхаваўчым працэсе адводзілася правядзенню рэвалюцыйных свят у школе. Вучэбныя кнігі ў асноўным прапаноўваліся тыя ж, што і пры прадметнай сістэме навучання.

Бібліятэка БГУІР

Праграма рэкамендавала вялікую колькасць вучэбных і метадычных дапаможнікаў, але абавязковы мінімум іх не вызначаўся.

Комплексная сістэма навучання прадугледжвала разнастайную працоўную дзейнасць школьнікаў. Кожны з трох напрамкаў комплексаў "Прырода", "Праца", "Грамадства" так ці інакш быў звязаны з працай. Азнаямленне з прыродай роднага краю ажыццяўлялася так, каб дзеці маглі не толькі зразумець і асэнсаваць многія з'явы прыроды, але і глыбока адчуць прыгажосць роднага краю, зразумець прыроду як тое натуральнае асяроддзе, якое ўзбагачае думкі і пачуцці чалавека.

Увядзенне комплексных праграм у Беларусі мела свае асаблівасці. У 1924/25 навучальным годзе яны ўводзіліся толькі ў I і II класах шматкамплектных школ; у III і IV класах намячалася ажыццявіць комплекснае выкладанне на працягу двух наступных гадоў. Аднак пасля праверкі стану вучэбнай работы ў некаторых школах калегія Наркамасветы растлумачыла, што з 1926/27 навучальнага года ў двухкамплектных школах выкладанне па гэтай сістэме ў IV класах павінна праводзіцца толькі па жаданні настаўнікаў. Да 1927/28 навучальнага года ўсе пачатковыя аднакамплектныя школы Беларусі (а іх у той час было больш паловы ўсіх пачатковых школ рэспублікі), а таксама V-VII класы сямігадовых школ прытрымліваліся прадметнай сістэмы навучання, таму што пытанне прымянення комплекснай праграмы лічылася спрэчным.

Значным крокам наперад у развіцці школы ў Беларусі з'явілася выданне Наркамасветы БССР у 1927 г. новых праграм для пачатковых і сямігадовых школ. Гэта былі некалькі змененыя, з улікам мясцовых умоў, праграмы Наркамасветы РСФСР 1927 г. Новыя праграмы для старэйшых класаў сямігодкі лічыліся комплекснымі. Вучэбны матэрыял размяшчаўся пераважна ў сістэме вучэбных прадметаў. Праграмы па рускай і беларускай мовах з комплексамі зусім не звязваліся. Істотным недахопам праграм 1927 г. па рускай і беларускай мовах з'яўлялася тое, што яны не арыентавалі настаўніка на дасягненне поўнай пісьменнасці вучняў. Ва ўмовах, калі II канцэнтр сямігодкі з'яўляўся апошнім звяном агульнаадукацыйнай школы, складальнікі праграм у тлумачальнай запісцы заяўлялі, што, на іх думку, выгвучэнне мовы павінна будавацца на трох канцэнтрах і заканчвацца ў спецыяльных навучальных установах або на розных курсах. Такім чынам прыніжалася адказнасць настаўніка за вынікі работы.

Важным было пытанне пра месца выхавання ў цэласнай сістэме вучэбна-выхаваўчай работьг. Цэнтрам усёй работы па выхаванні новага чалавека лічылася фарміраванне свядомых адносін да працы. У сувязі з гэтым звярталася ўвага на выхаванне калектывізму, патрыятьгзму, пралетарскага інтэрнацыяналізму, выхаванне асобы прадугледжвалася пераважна праз выхаванне вучнёўскага калектыву. Пры вызначэнні асноўных напрамкаў выхаваўчай работы акцэнт пераносіўся на тыя ідэйна-маральныя якасці, якія больш выразна падкрэслівалі грамадзянскую свядомасць вучняў. Так, у нарматыўным дакуменце Наркамасветы БССР "Асноўныя прынцыпы арганізацыі працоўнай сямігадовай школы" адным з вядучых прынцыпаў абвяшчалася сувязь навучання і выхавання з жыццём, шырокае ўцягненне вучняў у розныя віды працоўнай дзейнасці. Вялікае значэнне надавалася развіццю самастойнасці і актыўнасці вучняў. Рэкамендаваліся напрамкі дзейнасці вучняў: на вёсцы - праца ў агародзе, у садзе, у полі,

Библиотека БГУИР

догляд дамашняй жывёлы; у горадзе - праца на фабрыках і заводах. Гэты дакумент арыентаваў школу не на прафесіянальную падрыхтоўку, а на працоўнае выхаванне вучняў. Працоўны пачатак разглядаўся як аснова для фарміравання грамадзянскай свядомасці, пры гэтым прапагандаваліся ідэі калектывізму і розныя формы грамадскай дзейнасці вучняў.

У 1920-я гады адбывалася станаўленне педагагічнай навукі. Значная навукова-даследчая работа праводзілася Інстытутам беларускай культуры і кафедрай педагогікі Беларускага дзяржаўнага універсітэта. З'явіліся першыя даследаванні беларускіх вучоных па праблемах тэорыі выхавання, гісторыі педагогікі, політэхнізацыі школы, закладваліся новуковыя асновы беларускага савецкага мовазнаўства і літаратуразнаўства. Калектывамі вучоных і метадыстаў праводзілася актыўная работа па распрацоўцы навуковых асноў зместу агульнай адукацыі і падрыхтоўцы школьных праграм.

У распрацоўцы навуковых асноў зместу агульнай адукацыі прымалі ўдзел такія вядомыя ў Беларусі вучоныя і метадысты, як П.Я. Панкевіч, І.М. Салаўёў, У.І. Пічэта, І.І. Замоцін, Якуб Колас, М.І. Гарэцкі, Д.А. Жарыкаў, М.Я. Байкоў, Л.В. Шашкоў і іншыя. У працах беларускіх вучоных гэтага перыяду праблемы развіцця агульнаадукацыйнай школы разглядаюцца як частка агульнага комплексу праблем па перабудове грамадскага жыцця на новай аснове. Навуковыя працы беларускіх вучоных і метадыстаў, безумоўна, не ахоплівалі ўсёй сістэмы арганізацыі адзінай працоўнай школы, але шэраг пытанняў, узнятых у педагагічным друку 1920-х гадоў, сапраўды быў надзённым і актуальным. Сярод іх: узаемаадносіны паміж вучнямі ў школьным калектыве, роля і месца настаўніка ў кіраўніцтве пазнавальнай дзейнасцю вучняў, уплыў школы на выхаванне дзяцей у сям'і.

Адно з цэнтральных месц ва ўсёй сістэме работы ў школе ў 1920-я гады займала праблема фарміравання вучнёўскага калектыву. На складанасць гэтага пытання звярнуў увагу прафесар кафедры педагогікі Беларускага дзяржаўнага універсітэта І.М. Салаўёў. У артыкуле "Работа настаўніка па арганізацыі школьнага асяроддзя" ён адзначаў, што да ліку аб'ектыўных цяжкасцей у стварэнні дзіцячага калектыву патрэбна аднесці перш за ўсё адсутнасць у педагогаў вопыту грамадскага выхавання і няведанне прыроды дзіцячага калектыву. Сярод частых пытанняў арганізацыі жыцця і дзейнасці калектыву І. Салаўёў вылучаў наступныя: як могуць дзеці аб'ядноўвацца ў свае калектывы, якая роля тут будзе належаць дзецям-важакам, ці будзе ў дзіцячых аб'яднаннях перайманне жыцця дарослых, які можа быць узаемны ўплыў дзяцей рознага полу і ўзросту.

"Педагог, - падкрэслівае І.М. Салаўёў, - не ёсць той маг-дырыжор, ад якога ўсё паходзіць, які можа ўстанавіць усе нормы паводзін школьнага калектыву. Яму карысна часцей гаварыць: "мы", а не "я", часцей звяртацца да саміх дзяцей з наводзячымі пытаннямі; што "мы" будзем рабіць, як "мы" будзем наладжваць сумеснае жыццё, каб усім жылося добра і свабодна". У артыкуле адмаўляецца ўяўленне пра выхавальніка як аўтарытарную сілу і падкрэсліваецца, што ва ўсіх відах сумеснай дзейнасці школьнікаў ён павінен заставацца ў ролі старэйшага таварыша дзяцей. Падкрэсліваючы важнасць аб'яднання дзяцей асобных класаў, а іншы раз і ўсёй школы, для выканання грамадска карысных спраў, аўтар сцвярджаў, што асоба, дзякуючы сваёй прыналежнасці да

Библиотека БГУИР

калектыву, у працэсе сумеснай дзейнасці ўсё больш усведамляе сваю адказнасць за клас і за школу ў цэлым. Аўтар верыць у выхаваўчыя магчымасці дзіцячага калектыву, перасцерагае чытача-педагога "ад шкоднага прыцягнення дзяцей малодшых груп да суда і асуджэння свайго таварыша". Ён не дае рэкамендацый адносна таго, як павінен рэагаваць калектыў на правіннасці дзяцей, але пастаноўка пытання аб асцярожных адносінах вучнёўскага калектыву да асобы школьніка, безумоўна, заслугоўвала ўвагі.

У сваіх артыкулах і публічных выступленнях І.М. Салаўёў неаднаразова падкрэсліваў думку, што настаўнік - не непасрэдны арганізатар вучобы і працы дзяцей, а іх старэйшы таварыш, які ўскосна накіроўвае заняткі дзяцей і ў супрацоўніцтве з імі распрацоўвае тыя ці іншыя галіны ведаў. У працэсе гэтай сумеснай работы на першым месцы павінны быць жывыя назіранні і доследы, а не падручнік. Такім чынам, вучні прыходзяць да даступных іх разуменню вывадаў не ад прачытанага ў падручніку, а ад непасрэднага азнаямлення з рознымі з'явамі навакольнага жыцця. Настаўнік можа толькі падказаць, што выкарыстаць з падручніка, як найболып эканомна паўтараць раней пройдзенае, як вывучаць верш. Вучань, падкрэслівае І.М. Салаўёў, па сваёй прыродзе даследчык-эксперыментатар. Ён імкнецца спасцігнуць сувязь і заканамернасць уласцівасцей прадметаў, фактаў і з'яў. І працоўная школа дае яму не толькі веды як нешта закончанае, а ўзбройвае прыёмамі і метадамі работы. Яна вучыць школьніка шукаць, даследаваць, знаходзіць. Ён павінен зразумець, што толькі аб'яднанне, блізкасць і сувязь навук прыводзяць да светапогляду, цэласнага разумення жыцця, прыроды і чалавека.

У 1920-я гады пачынаў сваю навукова-даследчую дзейнасць вядомы беларускі педагог і метадыст В.А. Самцэвіч. Ён нарадзіўся ў сялянскай сям'і ў вёсцы Дакудава Крупскага раёна Мінскай вобласці. Пасля заканчэння Маладзечанскай настаўніцкай семінарыі (1908 г.) працаваў настаўнікам. У 1912 г. паступіў у Віцебскі настаўніцкі інстытут, па заканчэнні якога (1915 г.) быў прызваны ў дзеючую армію. Пасля дэмабілізацыі (1918 г.) вярнуўся да настаўніцкай работы і плённа працаваў на гэтай ніве ўсё сваё жыццё. Вывучаючы і абагульняючы вопыт выхаваўчай работы ў школах, В.А. Самцэвіч часта ўздымаў найбольш актуальныя пытанні арганізацыйна-педагагічнай дзейнасці педагагічных калектываў. У яго артыкулах, змешчаных у часопісе "Асвета", прынцыпова ставіліся пытанні працоўнага і політэхнічнага выхавання школьнікаў, арганізацыі іх вольнага часу, удзелу ў грамадска карыснай працы. Метадычныя артыкулы настаўніка-наватара прыцягвалі ўвагу чытачоў да нявырашаных праблем навучання і выхавання, будзілі творчую думку.

Развіццё школ выклікала неабходнасць стварэння падручнікаў. Яшчэ III Усебеларускі з'езд Саветаў (1922 г.) прызнаў выданне падручнікаў неабходнай справай Наркамасветы і абавязаў іншыя камісарыяты аказваць яму неабходную дапамогу ў выдавецкай дзейнасці. Выданне вучэбнай літаратуры штогод павялічвалася, нягледзячы на тое, што не хапала паперы і не была развіта паліграфічная база рэспублікі.

У першых букварах і кнігах для чытання знайшлі адлюстраванне жыццё і праца сялян, вясковы быт, якімі яны былі ў дарэвалюцыйны час, жыццё сялянскіх дзяцей. Складальнікі кніг для чытання ў значнай меры абапіраліся на вопыт народнай педагогікі і творчую спадчыну К.Д. Ушынскага. Побач з матэрыялам для чытання змяшчаліся

Библиотека БГУИР

заданні для назірання за прыродай і розныя віды практычныгх заданняў, колькасць і ступень складанасці якіх паступова ўзрасталі ад малодшых да старшых класаў.

Для агульнаадукацыйных школ быглі выдадзены наступныя арыгінальныя вучэбныя дапаможнікі: "Сінтаксіс беларускай мовы ў назіраннях і практыкаваннях і тэхніка пісьмовай мовы" Івана Іовіча Пратасевіча, "Беларуская мова" Анатоля Васільевіча Багдановіча, падручнікі Язэпа Юр'евіча Лёсіка. У школах рэспублікі шырока карысталіся "Беларускай граматыкай для школ" Браніслава Адамавіча Тарашкевіча.

У праграмах беларускіх нацыянальных школ яе пачэснае месца занялі беларуская мова і літаратура. Ствараліся падручнікі па гэтых прадметах, распрацоўвалася методыка выкладання іх у навучальных установах розных тыпаў. Сярод тых, каму беларуская нацыянальная школа наогул і методыка выкладання беларускай мовы і літаратуры ў прыватнасці абавязаны сваімі значнымі поспехамі, адно з першых месцаў належыць Івану Іовічу Пратасевічу. Нарадзіўся ён у вёсцы Клешава (цяпер Слуцкі раён) у сялянскай сям'і. Скончыўшы ў 1918 г. літаратурна-гістарычнае аддзяленне Віленскага настаўніцкага інстытута, выкладаў рускую мову і літаратуру на Случчыне. У 1923 г. пасля заканчэння курсаў беларусазнаўства ў Слуцку, І.І.Пратасевіч пераехаў у Мінск і пачаў выкладаць беларускую мову і літаратуру ў Цэнтральнай сямігадовай даследчай школе ( 1923 - 1925 ), потым на рабфаку пры Беларускім дзяржаўным універсітэце.

Ен быў высокакваліфікаваны выкладчык, імкнуўся, не толькі даць сваім навучэнцам грунтоўныя веды, але і развіваць іх творчыя здольнасці. Выкладчыцкую працу у Цэнтральнай сямігадовай даследчай школе і на рабфаку І.І.Пратасевіч спалучаў з навуковай і метадычнай. Асаблівая ўвага надавалася ім складанню падручнікаў і навучальных дапаможнікаў па беларускай літаратуры і мове для агульнаадукацыйных школ. Так, у 1925 г. выйшла з друку літаратурная чытанка для 4-га года навучання "Наш сцяг", складзеная І.І. Пратасевічам сумесна са сваімі калегамі па працы ў Цэнтральнай сямігадовай школе І.К. Самковічам і Л.М. Гарбацэвічам. Некалькі выданняў вытрымала і чытанка "Родныя шляхі", складзеная І.І. Пратасевічам і І.К. Самковічам. Яна прызначалася для V - VII класаў сямігадовай школы. У 1927 г. выйшла ў свет " Рабочая кніга па беларускай мове ", ухваленая навукова-метадычным кабінетам Наркамасветы БССР для школ-сямігодак, школ сялянскай моладзі і рабфакаў (перапрацаваная выйшла ў 1927 і 1931 гг. ужо пад другой назвай). У 1928 г. імі выдадзены "Сінтаксіс беларускай мовы ў назіраннях і практыкаваннях", у 1931 г. — "Сінтаксіс беларускай мовы ў назіраннях і практыкаваннях і тэхніка пісьмовай мовы".

Школьныя падручнікі, напісаныя І.І. Пратасевічам і яго калегамі па працы, былі значнымі з'явамі ў вывучэнні мовы і літаратуры ў 1920-я - пачатку 1930-х гадоў у Беларусі. Жорсткая ўстаноўка на партыйнасць і класавасць, якая паступова ўсе больш укаранялася ва ўсе сферы жыцця нашай краіны, перашкаджала аўтарам поўнасцю рэалізаваць у падручніках свае навуковыя і метадычныя ідэі, прымушала пры перавыданні мастацкія і публіцыстычныя тэксты агульначалавечага і агульнапазнавальнага зместу замяняць палітызаванымі.

Библиотека БГУИР

У 1928/29 навучальным годзе быў зраблены крок наперад у выданні вучэбных дапаможнікаў, арыгінальнай і перакладной мастацкай літаратуры. Аб'ём выдадзеных вучэбных дапаможнікаў на беларускай мове складаў 17 450 тыс. друкаваных аркушаў, на яўрэйскай - 660 тыс, на польскай - 390 тыс. аркушаў. Тыраж кніжнай прадукцыі складаў: на беларускай мове - 1 364 700 экзэмпляраў, яўрэйскай - 112 тыс, польскай - 325 тыс. [25, арк.87]. У 1930/31 навучальным годзе I канцэнтр агульнаадукацыйнай школы быў забяспечаны падручнікамі на 73%, II канцэнтр - на 27% [28, арк.26]. Падручнікі, выдадзеныя ў РСФСР, перакладаліся на беларускую мову.

У 20-30-я гады разгарнулася актыўная педагагічная і навуковая дзейнасць Якуба Коласа (К.М. Міцкевіча). Калі надышла Кастрычніцкая рэвалюцыя, Якуб Колас знаходзіўся ў дзеючай арміі на румынскім фронце. Пасля дэмабілізацыі ён некаторы час працаваў настаўнікам, а потым інструктарам аддзела народнай асветы ў Курскай губерні. У Беларусь ён вярнуўся ў маі 1921 г. Ужо ў чэрвені таго ж года Якуб Колас быў уключаны ў склад навукова-тэрміналагічнай камісіі ў Акадэмічным цэнтры Наркамасветы ССРБ. У пачатку 1922 г. на базе гэтай камісіі быў заснаваны Інстытут беларускай культуры (Інбелкульт), правадзейным членам якога выбіраецца Якуб Колас. Пры яго ўдзеле распрацоўвалася навуковая тэрміналогія па ўсіх прадметах школьнай праграмы, праводзілася работа па збору твораў вуснай народнай творчасці. Якуб Колас быў актыўным удзельнікам Першай беларускай акадэмічнай канферэнцыі, прысвечанай рэформе беларускага правапісу і алфавіту.

Адначасова з навукова-даследчай дзейнасцю ў Інбелкульце Якуб Колас уключыўся ў актыўную педагагічную работу. З 1 верасня 1922 г. ён стаў выкладаць методыку роднай мовы ў Мінскім педагагічным тэхнікуме. Летам 1923 г. па даручэнню Наркамасветы выступаў у Слуцку з лекцыямі па граматыцы і методыцы выкладання беларускай мовы на настаўніцкіх палітыка-педагагічных курсах. Праграма курсаў прадугледжвала агульнаадукацыйную і метадычную падрыхтоўку. Якуб Колас выкарыстаў курсы не толькі для метадычнай вучобы настаўнікаў, але і для таго, каб высветліць, у якіх умовах знаходзяцца школы. Прааналізаваўшы сачыненні слухачоў курсаў, якія пісалі пра цяжкія умовы работы вясковых школ, ён адразу ж пасля заканчэння работы курсаў выказаў сваё ўражанне пра становішча школ на Случчыне. Адзначаючы добрую арганізацыю курсавой падрыхтоўкі (на курсах навучалася 157 настаўнікаў), Якуб Колас звяртаў увагу грамадскасці на неабходнасць паляпшэння матэрыяльнага становішча настаўнікаў і ўмацавання матэрыяльнай базы спустошаных за гады гаспадарання акупантаў школ.

Якуб Колас адстойваў права беларускіх дзяцей вучыцца на роднай мове. У свой час К.Д. Ушынскі ў артыкуле "Роднае слова" пісаў пра тое, што, пакуль жыве мова народа, датуль жыве і сам народ. Навучанне ж на роднай мове ажыццяўляецца значна лягчэй, чым на любой іншай.

Аднак галоўны клопат Якуба Коласа як педагога і вучонага заключаўся ў тым, каб узняць на належны ўзровень выкладанне беларускай мовы і літаратуры. Пачынаючы з кастрычніка 1923 г. і да 17 студзеня 1926 г. Якуб Колас працаваў выкладчыкам беларускай мовы на педагагічным факультэце Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Пастановай Наркамасветы БССР ў красавіку 1925 г. ён адначасова быў зацверджаны выкладчыкам

Библиотека БГУИР

вышэйшых курсаў беларусазнаўства, выступаў з лекцыямі перад студэнтамі Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі, Мсціслаўскага педагагічнага тэхнікума, а таксама перад настаўнікамі ў Калінінскай і Аршанскай акругах.

Частыя сустрэчы са студэнтамі, выкладчыцкая работа на вышэйшых курсах беларусазнаўства, непасрэдны абмен думкамі з настаўнікамі беларускай мовы і літаратуры ўзбагацілі метадычную сістэму Якуба Коласа, стымулявалі да творчага асэнсавання заканамернасцей працэсу авалодання роднай мовай.

У пачатку 1920-х гадоў школы ў БССР пераходзілі да выкладання ўсіх прадметаў на беларускай мове. Настаўнікі адчувалі вострую нястачу падручнікаў і метадычнай літаратуры. Якуб Колас, які працаваў у той час выкладчыкам методыкі беларускай мовы ў Мінскім Белпедтэхнікуме, вырашыў дапамагчы настаўнікам пачатковых школ і студэнтам педагагічных тэхнікумаў.

Абапіраючыся на багаты асабісты вопыт педагагічнай працы і на прагрэсіўныя тэндэнцыі ў развіцці савецкай методыкі, Якуб Колас выдаў у 1926 г. кнігу для настаўнікаў пачатковай школы "Методыка роднае мовы". У кнізе шырока выкарыстаны працы рускіх метадыстаў, агляду якіх прысвечаны спецыяльны раздзел. У прадмове да "Методыкі" аўтар тлумачыў, што ў кнізе прапануюцца такія метады навучання, якія найбольш задаволяць густ настаўніка, "каб, выбраўшы адпаведны метад, ён мог карыстацца ім у сваёй практычнай рабоце". Якуб Колас лічыў, што на працягу навучання ў пачатковай школе вучань павінен навучыцца чытаць і пісаць, авалодаць неабходным мінімумам ведаў па граматыцы і развіць здольнасці вуснай мовы. Ён зусім правільна вызначыў месца роднай мовы сярод іншых прадметаў у школе і ўказваў, што родная мова мае агульнаадукацыйнае, выхаваўчае і практычнае значэнне. Умелае карыстанне ёю для выказвання ўласных думак - канчатковая мэта навучання роднай мовы. Якім жа метадам трэба карыстацца пры навучанні грамаце? - ставіць ён пытанне і адказвае: "Найлепшым метадам лічыцца той, які найскарэй, найпрасцей, найлягчэй, найразумней вядзе да мэты" [29, с.10]. Аўтар "Методыкі роднай мовы" накіроўвае ўвагу настаўніка на самастойны выбар метадаў навучання, а не на той, што навязвалі школе некаторыя "метадысты".

Непасрэдная педагагічная дзейнасць Якуба Коласа працягвалася прыкладна да пачатку 1929 г., аднак апошні год ён ужо не працаваў у якасці выкладчыка методыкі роднай мовы, а часцей выступаў як лектар на сустрэчах са студэнтамі і настаўнікамі. Ён у навукова-педагагічнай дзейнасці з кожным годам усё больш надаваў перавагу праблемам навукі; пашыраў дыяпазон культурна-асветніцкай, арганізацыйна-педагагічнай і грамадскай дзейнасці.

26 кастрычніка 1929 г. на пасяджэнні акадэмічнага савета Якуб Колас выбіраецца віцэ-прэзідэнтам і членам прэзідыума Беларускай акадэміі навук.

Адной з важнейшых праблем Савецкай улады ў галіне народнай адукацыі з'яўлялася забеспячэнне школ настаўніцкімі кадрамі. Паколькі прафесіянальных кадраў не хапала, да выкладання ў школах часта прыцягваліся асобы, якія мелі толькі агульную або нават незакончаную адукацыю. У 1925/26 навучальным годзе настаўнікі з вышэйшай адукацыяй у школах рэспублікі складалі 13,3%, з сярэдняй - 60,8% [30, с.416]. Да 1926/27 навучальнага года школы былі забяспечаны настаўнікамі поўнасцю, але іх склад не зусім

Библиотека БГУИР

задавальняў: з 1 204 настаўнікаў, якія былі прызначаны ў працоўныя школы, толькі 510 (42,3%) атрымалі педагагічную адукадыю, астатнія 57,7% пераважна скончылі агульнаадукацыйныя курсы і былыя сярэднія школы. Большая частка настаўнікаў чатырохгодак - 63% не мела педагагічнай адукацыі, а толькі скончыла курсы (а ў РСФСР толькі 22%) [ 22, арк.8]. Таму, у дапамогу настаўніку, у адпаведнасці з рашэннем IV з'езда Саветаў БССР (снежань 1922 г.) у рэспубліцы стваралася сетка дамоў работнікаў асветы, адкрываліся палітыка-асветніцкія курсы, палітычныя гурткі, паляпшалася забеспячэнне настаўнікаў палітычнай і педагагічнай літаратурай. Для растлумачэння настаўнікам палітыкі партыі і згуртавання іх вакол Савецкай улады праводзіліся настаўніцкія канферэнцыі і з'езды.

У барацьбе за новую школу фарміраваліся кадры педагогаў, нястомных у пошуках найболын дзейсных форм і метадаў навучання і выхавання дзяцей. Сярод іх - народныя настаўнікі М.П. Дарафеенка, К.І. Шапялевіч, В.П. Александроўская, Р.Н. Гацко, Г.К. Севярнёва, З.Я. Ліхтарман, А.С. Карзон, К.Д. Бязносік, Н.І. Сіўко, Ю. Шакаль, Т.П. Сапелкіна, І.С. Вадэйка, якія ўсё сваё жыццё прысвяцілі развіццю народнай асветы.

Такім чынам, сістэма школьнай адукацыі Беларусі прынцыпова адрозніваласяад той сістэмы, якая існавала ў дакастрычніцкі час. Цяпер адукацыю маглі атрымаць усе сацыяльныя пласты насельніцтва за кошт дзяржавы. Аднак сістэма народнай адукацыі не з'яўлялася цэласнай і завершанай - у ёй адсутнічала сярэдняя агульнаадукацыйная школа. Сямігодка не магла забяспечыць дастатковай падрыхтоўкі моладзі для працягвання адукацыі ў вышэйшай школе. Гэта акалічнасць ускладняла камплектаванне і развіццё вышэйшай школы.

Асобнае месца ў сістэме адукацыі займалі школы сялянскай моладзі і фабрычна-заводскія сямігодкі. Уся вучэбна-выхаваўчая работа ў іх цесна ўвязвалася з вытворчай дзейнасцю, з грамадска-палітычным жыццём працоўнага калектыву.

У пачатку 1920-х гадоў дзяржава знаходзілася ў вельмі цяжкім фінансава-эканамічным становішчы. Адсутнасць неабходных фінансавых рэсурсаў для развіцця народнай адукацыі вымусіла урад дзяржавы пайсці на некаторыя змены: уводзіліся плата за навучанне ў старэйшых класах школ гарадоў і мястэчак, самаабкладанне сельскага насельніцтва на карысць школы, калектыўныя дагаворы на ўтрыманне школы ў вёсцы. Створаныя школьна-гаспадарчыя саветы клапаціліся пра забеспячэнне школ абсталяваннем, арганізоўвалі рамонт памяшканняў, праводзілі суботнікі, нядзелі дапамогі школе.

Дзейнасць органаў дзяржаўнай улады была накіравана на ўвядзенне ўсеагульнага абавязковага навучання. У 1930/31 навучальным годзе БССР у асноўным ажыццявіла ўсеагульнае абавязковае навучанне дзяцей 8-10 - гадовага ўзросту, а таксама падросткаў ва ўзросце 11-15 гадоў. Пачалася работа па ажыццяўленні ўсенавуча ў аб'ёме сямігадовай школы.

У сістэме школьнай адукацыі праводзілася работа па забеспячэнні працоўных усіх нацыянальнасцей магчымасці атрымаць адукацыю на роднай мове. У рамках палітыкі беларусізацыі, большасць пачатковых, частка сямігадовых школ былі пераведзены на беларускую мову навучання. У праграмах беларускіх нацыянальных школ пачэснае

Библиотека БГУИР

месца занялі беларуская мова і літаратура. Ствараліся падручнікі па гэтых прадметах, распрацоўвалася методыка выкладання іх у навучальных установах рознага тыпу.

Выдаваліся падручнікі, вучэбныя дапаможнікі па ўсіх прадметах для вучняў агульнаадукацыйных школ. Нягледзячы на тое, што не хапала паперы і не была развіта паліграфічная база рэспублікі, выданне вучэбнай літаратуры штогод павялічвалася.

Важную ролю ў вучэбна-выхаваўчым працэсе адыграла выданне вучэбных планаў і праграм агульнаадукацыйных школ. У 1922 і 1924 гг. былі выдадзены праграмы прадметнай формы навучання. Яны арыентавалі настаўніка галоўным чынам на тэарэтычнае вывучэнне курса школьных прадметаў. У 1925 г. выдадзены праграмы для пачатковай школы, складзеныя ў адпаведнасці з патрабаваннямі комплекснай сістэмы навучання. Пры такой сістэме месца прадмета займаў комплекс: вывучаліся не вучэбныя прадметы, а пэўныя аб'екты і з'явы навакольнага жыцця. У 1927 г. былі падрыхтаваны і выйшлі ў свет новыя праграмы для пачатковых і сямігадовых школ. Новыя праграмы для старшых класаў сямігадовых школ лічыліся комплекснымі.

У 1920-я гады адбывалася станаўленне педагагічнай навукі, праводзілася навукова-даследчая работа. З'явіліся першыя даследаванні беларускіх вучоных па праблемах тэорыі выхавання, гісторыі педагогікі, політэхнізацыі школы. Закладваліся навуковыя асновы беларускага савецкага мова- і літаратуразнаўства. Калектывамі вучоных і метадыстаў праводзілася актыўная работа па распрацоўцы навуковых асноў зместу агульнай адукацыі.

Библиотека БГУИР

## Літаратура:

1. Два гады нацыянальнай работы ў БССР: (Збор прамоў, артыкулаў і рэзалюцый па нацыянальным пытанні): Менск, выд. нац. Камісіі ЦВК БССР, 1929.-168с.

2. Белорусская ССР в цифрах: К 10-летию существования БССР. 1919-1929 / Центр. стат. упр.-Минск, 1929.-534с.

3. Нацыянальны Архіў Рэспублікі Беларусь у г. Мінску (НА РБ у г. Мінску) ф.101 (Наркамат рабоча-сялянскай інспекцыі БССР), воп.1,спр.2190.

4. Нацыянальны Архіў Рэспублікі Беларусь у г. Мінску (НА РБ у г. Мінску) ф.701 (Нацыянальная камісія пры ЦВК БССР), воп.1,спр.10.

5. Асноўныя прынцыпы арганізацыі працоўнай 7-мёх гадовай школы.-Мінск.: Дзярж. Выд. Беларусі, 1921.-7с.

6. Статут адзінай працоўнай школы БССР.-Мінск. Выд. народнага камісарыяту асветы,-1926.-50с.

7. Нацыянальны Архіў Рэспублікі Беларусь у г. Мінску (НА РБ у г. Мінску) ф.42 (Наркамат асветы БССР), воп.1,спр.1.

8. В Народном Комиссариате Просвещения ССРБ (Хроника) // Школа и культура Советской Белоруссии.-1921.- №1-2 - С.98-111.

9. Балицкий А. Итоги и план работы Наркомпроса Белоруссии // Вестник, Народного Комиссариата Просвещения С.С.Р.Б.-1922.-Вып.9-10-С.3-8.

10. Культурное строительство БССР. Издание УМХУ БССР. Минск.1940.-109с.

11. В Народном Комиссариате Просвещения. Реорганизация Наркомпроса. Вестник Народного Комиссариата Просвещения С.С.Р.Б.-1922-№5-6 (Вып.7-8).-С51.

12. НА РБ ф.101, воп.1,спр.2175.

13. Белорусская Социалистическая Республика в 1922-23 г.: К 5-му съезду Советов Белоруссии: Отчет / Сост. под обод. ред. Секретариата ЦИК и СНКБ.-Минск, -1924.-20с.

14. НА РБ, ф.42, воп.1, спр.1687.

15.Праграма школ сялянскай моладзі // Асвета.-1928.-№5.-С.124-125.

16. Ильюшин Н.М., Умрейко С.А. Народное образование в Белорусской ССР.-Минск: Учпедиз БССР, 1961.-438с.

17. Аб фабрычна-заводскай 7-годцы. Асноўныя прынцыпы арганізацыі фабрычна-заводскай сямігодкі // Асвета.-1928.-№7.-С.10-11.

18. НА РБ, ф.42, воп.1, спр.603.

19. Постановления 5-го Всебелорусского съезда Советов.-Минск,-1924.-30с.

20. НА РБ, ф.42, воп.1, спр.675.

21. НА РБ, ф.42, воп.1, спр.840.

22. НА РБ, ф.42, воп.1, спр.323.

23. Дзейнасць Урада БССР за 1926/27 г.-Мінск. Выд. кіраўніцтва спраў СНК і Экран. нарады БССР, 1928.-339с.

24. НАРБ, ф.42, воп.1, спр.1679.

25. НАРБ, ф.42, воп.1, спр.1688.

26. Д. Сцепуро. Всеобщее обучение в БССР. М.-Л.-Госиздат,-1931.-24с.

Библиотека БГУИР

27. Гісторыя Беларусі: Вучэб. дапам. для ВНУ: У 2 -х ч. / Пад. рэд.: Я.К.Новіка, Г.С. Марцуля.-Ч.2.-Мінск: Універсітэцкае, 1998.- люты 1917-1997 гг.-463с.

28. НА РБ, ф.101, воп.1,спр.3107.

29. К.М. Міцкевіч. Методыка роднай мовы.-Мінск: Дзярж. выд. Беларусі,- 1926.-С.10.

30. Белорусская Советская Социалистическая Республика.-Минск: СНК, 1927.-528с
Библиотека БГУИР